Источник: "Звязда" - 2012-06-12

# НАВУКОЎЦЫ З БЕЛАРУСІ, РАСІІ І УКРАІНЫ АБМЯРКУЮЦЬ АГУЛЬНУЮ ГІСТОРЫЮ

**Міжнародная канферэнцыя «Расія, Беларусь, Украіна: гісторыя, сучаснасць, будучыня» пройдзе 12-13 чэрвеня ў Мінску. Арганізатары канферэнцыі — аддзяленне гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі, Інстытут гісторыі НАН Беларусі і прадстаўніцтва Рассупрацоўніцтва ў Рэспубліцы Беларусь — Расійскі цэнтр навукі і культуры ў Мінску.**

Падчас канферэнцыі прадстаўнікі акадэмічнай і ўніверсітэцкай навукі трох краін, а таксама грамадскія дзеячы, студэнты і школьнікі абмяркуюць пытанні зараджэння дзяржаўнасці ва ўсходнеславянскіх землях, палітычнае развіццё славян у сярэднявеччы, узаемаадносіны Расіі і Расійскай імперыі з навакольнымі краінамі, гістарычны вопыт савецкага перыяду і іншыя пытанні. Таксама будуць прэзентаваны дзве фотавыставы, адбудзецца ўзнагароджанне пераможцаў і лаўрэатаў інтэрнэт-віктарыны, прысвечанай 200-годдзю перамогі ў вайне 1812 года.

**Іван СТУЖКА.**